Cana numaru 10 hr. Przesyłka opłacona ryczałtem.

Nr. 1 (694). Wilnia, Niadziela 14 Sakawika 1937 h. Hod XX.

Wiskont Ant. Garbarska

БЕЛАРУСКАЯ КРЫНІЦА | BIEŁARUSKAJA KRYNICA

Palityčnaja, hramadzkaja i litaraturnaja hazeta.

Adrys Redakcyi i Administracyi: WILNIA, ZAWALNAJA 1—1 (Wilno, Zawalna 1—1). Redakcyja adčynlena ad 9-taj hadz. ranicy da 4-taj wieč.

Hazeta wychodzić raz ŭ tydzień.

Košty wydawańnia pakrywajuć składki. Składka ŭ hod 4 zał., na paŭhoda—2 zał., na 3 mies.—1 zał. Cana abwiestak pawodle ŭmowy.

Закрыцьце і адкрыцьце „БЕЛАРУСКАЙ КРЫНІЦЫ“

Нашая газэта — *„Беларуская Крыніца“* ад пачатку сёлетняга 1937 году ня выходзіла з прычыны ад нас незалежнай — была спынена гэткай пастановай Суду:

Nr. spr. Pras. 159/36

Wyciąg z protokółu wspólnego posiedzenia niejawnego z dnia 18 grudnia 1936 r. Sąd Okręgowy w Wilnie w składzie następującym:
Przewodniczący J. Zaniewski
Sędziowie A. Orlicki i W. Drac
Wiceprokurator St. Wolski
Protokólant S. Falecki
po rozpoznaniu wniosku Prokuratora Sądu Okręgowego w Wilnie o zatwierdzenie zajęcia nakładu Nr 48 czasopisma pt. „Biełaruskaja Krynica" oraz o zastosowanie względem tegoż czasopisma jako środka zapobiegawczego zawieszenia i po wysłuchaniu wniosku Prokuratora,

p o s t a n o w i ł:

zajęcie zatwierdzić i czasopismo: „Biełaruskaja Krynica“ zawiesić.

U Z A S A D N I E N I E

Stałe dokonywanie przez wymienione wyżej czasopismo przestępstw, przewidzianych w kodeksie karnym oraz ich charakter godzący w porządek publiczny jak również komunistyczny kierunek tego pisma, są — wybitnie szkodliwe dla interesów Państwa Polskiego.

Na oryginale właściwe podpisy.

Супроць гэтай пастановы адвакат Бр. Олехновіч ад імя выдавецтва *„Беларускай Крыніцы“* ў адпаведным тэрміне і парадку падаваў рэкурс у Апэляцыйны Суд, які не разглядаючы справы мэрытарычна выдаў пастанову, што вырашэньне справы спыненьня *„Бел. Крыніцы“* належыць да компэтэнцыі галоўнай расправы Суду, які будзе разглядаць цэласьць усяе справы.

Гэтая справа апынулася ў Віленскім Гарадзкім Судзе, які на галоўнай расправе, разглядзеўшы цэласьць усяе справы, выдаў *апраўдваючы і касуючы спыненьне* (завешаньне) *„Беларускай Крыніцы“* прысуд гэткага зьместу:

Nr. akt II. Kg. 576/37 r. Odpis

Sentencja wyroku. W imieniu Rzeczypospolitej Polskiej. Dn. 27 lutego 1937 r. Sąd Grodzki w Wilnie Wydział— Oddział — Karnym w składzie następującym: Sędzia J. Kotwicki. Protokólant apl. Bednarek w obecności oskarżyciela publicznego Prok. Popow rozpoznawszy dn. 25 lutego 1937 r. sprawę: Adama Dasiukiewicza urodz. 5.VI.1911 r. syna Jana i Zofii Terpiłowskich oskarżonego o to, że w dniu 27.XI.1936 r. w Wilnie będąc redaktorem odpowiedzialnym czasopisma w języku białoruskim p. t. „Biełaruskaja Krynica" zamieścił w zamiarze publicznego rozpowszechnienia w nakładzie Nr. 48, tegoż czasopisma z datą 29.XI.1936 r. artykuł p.t. „Studenckie Zaburzenia w Wilnie" i „Studenci Białorusini", zawierający w treści swej fałszywe i mogące wywołać niepokój publiczny wiadomości, iż antysemickie zajścia wśród młodzieży akademickiej U.S.B. w Wilnie ostrzem swym mogą się zwrócić również przeciwko Białorusinom, lecz zamierzonego celu nie urzeczywistnił z przyczyn od niego niezależnych, gdyż nakład został zajęty przez władze, to jest o czyn, przewidziany w art. 23 i 170 K. K.

p o s t a n o w i ł:

Adama Dasiukiewicza z oskarżenia go o to, że dnia 27.XI.1936 r. w Wilnie będąc redaktorem odpowiedzialnym czasopisma w języku białoruskim p. t. „Biełaruskaja Krynica" zamieścił w zamiarze publicznego rozpowszechnienia w nakładzie Nr. 48 tegoż czasopisma z datą 29.XI.1936 r. artykuł p. t. „Studenckie Zaburzenia w Wilnie" i „Studenci Białorusini", zawierający w treści swej fałszywe i mogące wywołać niepokój publiczny wiadomości, iż antysemickie zajścia wśród młodzieży akademickiej U.S.B. w Wilnie ostrzem swym mogą się zwrócić również przeciwko Białorusinom, lecz zamierzonego celu nie urzeczywistnił z przyczyn od niego niezależnych, gdyż nakład został zajęty przez władze — uniewinnić. Postanowienie Sądu Okręgowego w Wilnie z dnia 18 grudnia 1936 r. zatwierdzające zajęcie nakładu Nr. 48, czasopisma „Biełaruskaja Krynica" z 1936 r. oraz zawieszające czasopismo „Biełaruskaja Krynica" uchylić. Rocznik czasopisma „Biełaruskaja Krynica" za 1936 r. zwrócić Adamowi Dasiukiewiczowi. Koszty postępowania w sprawie ponosi Skarb Państwa.

(—) J. Kotwicki. —

Бараніў у Судзе гэтую справу ведамы віленскі адвакат Бр. Олехновіч.

Такім чынам *„Беларуская Крыніца“* здабыла сабе ўзноў свабоду выхаду ў сьвет — здабыла права грамадзкасьці і поўную рэгабілітацыю.

Пры гэтым адзначаем, што *„Беларуская Крыніца“* і далей будзе трымацца дасюлешняй сваей народнай ідэёва-палітычнай (народна-беларускай і дэмакратычнай) і грамадзкай лініі.

Centr. Biblioteka

126020

1936

Усе разам за родную асьвету!

Так, усе. І старыя і малыя беларусы павінны ўзяцца за сваю родную беларускую асьвету. Што знача, за сваю асьвету? Ці-ж асьвета можа быць свая і не свая? Ці-ж асьвета не адна і тая самая на ўсім культурным сьвеце? Так, у сутнасьці асьвета адна і тая самая ўсюды, але, каб які народ мог дайсьці да яе, каб мог зразумець ня толькі аб чым іншым, але і аб сабе самым, дык трэба, каб асьвета яго адбывалася ў яго роднай мове, бо гэтак найлягчэй прасьвячацца, і трэба, каб гэна асьвета была арганічна зьвязана з яго жыцьцём, з яго патрэбамі, каб беспасрэдна служыла яго жыцьцю, яго народнай культуры. Гэтак сама мусіць быць і з асьветай нашага беларускага народу. Знача, існуе ў гэткім значэньні і нацыянальная асьвета, існуе і беларуская і гэткая іменна нацыянальная асьвета зьяўляецца першым варункам, першай вымогай асьветы агулам, ці шырэй гаворачы — культуры.

Гэта разумеюць усе сьвятлейшыя беларусы і гэткім шляхам бязупынна стараюцца весьці свой народ да сьвятла — да культуры.

Беларусы энэргічна браліся і бяруцца за справу сваей роднай беларускай школы, бо-ж гэткая школа ёсьць найлепшым спосабам і правадніком асьветы кожнага народу. Бяруцца беларусы так-жа за асьвету і спосабам хатняга навучаньня — за асьвету пазашкольную.

На асьвету ў роднай мове беларусы маюць ня толькі прыроднае права, але і пісаныя законы. Вось яны: Канстытуцыя Польскай Дзяржавы і так званыя языковыя ўставы, выданыя ў сваім часе для нацыянальных меншасьцяў, якія яшчэ сваей праўнай сілы ня страцілі, а так-жа і розныя Мірныя міжнародныя трактаты, якія падпісала і Польшч, як Трактат Вэрсальскі і Трактат Рыскі — усім народам, што жывуць у Польскай Дзяржаве, гварантуюць права на іх мову, школу, асьвету, культуру. Такім чынам, калі-б нам дзеля якіх прычын і не ўдалося раз ці многа раз у справе сваей асьветы і культуры, дык гэта ня знача, што мы павінны гэту справу пакінуць. Не. Апіраючыся на гэных правох, якія Польшч нам гварантуе законнай дарогай, мы павінны бязупынна працаваць на ніве роднай асьветы, не зважаючы на ніякія труднасьці.

Вось-жа, не пакідаючы і надалей працы беларускай за родную школу, вобак з ей мусімо ўзяцца за родную асьвету пазашкольную, як шмат лягчэйшую да зьдзейсьненьня. Хто-ж мае гэтую так важную і так высокую і сьвятую справу сярод беларускага народу ў Польскай Дзяржаве правадзіць? Дужа проста. Рабіць гэта мае кожны той, хто да гэтага так ці інакш здатны. Ёсьць па нашых сёлах ці мала безработных беларусаў вучыцялёў і розных іншых — так-жа пераважна безработных інтэлігентаў, а йшчэ больш ёсьць розных даволі значна граматных сялян і сялянак. Да гэт[illegible] усіх беларусаў належа аба[illegible] зак быць на нашым сяле сь[illegible] тачам беларускай асьветы.

А якім спосабам гэтыя [illegible]шыя асьвечаныя людзі маюць несьці асьвету сваім цёмным братом? Надта проста. Яны маюць гэта рабіць так, як ім падыхтуе іх жыцьцёвая практычная мудрасьць. З гісторыі адраджэньня літоўскага народу ведаем, якую вялікую роль у літоўска-народнай асьвеце і нацыянальнай сьведамасьці адыгралі літоўскія маткі, што прадучы, тут-жа пры калаўроце, вучылі літоўскай граматы сваіх дзетак. Гэтую вялікую і сьвятую дзейнасьць літоўскіх жанчын літоўскі мастак увекавечыў у сваім творстве. Так і беларусы павінны вучыць сваіх цямнейшых братоў граматы ўсімі законнымі спосабамі, якія яны будуць уважаць адпаведнымі і карыснымі.

Ды ня цяжка гэта і зрабіць. У нас ёсьць ужо з чаго вучыць іншых і вучыцца самым. Для гэтай мэты служа дужа добра кніжка С. Паўловіча **„Першыя Зернятка"**. З гэтай кніжкі могуць вучыцца роднай беларускай граматы і дзеці і старэйшыя.

Хутка выйдзе з друку другая падобная кніжка таго-ж С. Паўловіча, друкаваная лацінскімі літарамі, пад назовам **„Zasieŭki"**, якая так-жа будзе новым праваднікам беларускай граматы і дужа адпаведным падручнікам навучаньня гэтай граматы.

Існуюць у нас літаратурна-

навуковыя і культурна-асьветныя часапісы: „Калосьсе“, „Шлях Моладзі“, „Летапіс“, якія вобак з навуковымі артыкуламі аб беларускім народзе, друкуюць так-жа творы сучасных беларускіх паэтаў і пісьменьнікаў, а гэта ўсё якімжа прыгожым ёсьць матарыялам дзеля роднай граматы і асьветы!

Папулярную веду аб беларускай гаспадарцы — практычнай і тэорэтычнай — нясе „Самапомач“, якая з новага году абнавілася і пачала выходзіць замест раз, два разы ў месяц.

Нямала можа так-жа прычыніцца да справы роднай асьветы і „Chryścijanskaja Dumka“, двутыднёвік для беларусаў каталікоў, які бесстаронна асьвячае з пункту гледжаньня хрысьціянскага беларускія нацыянальныя справы. Апрача гэтага часапіс гэты мае дадатак „Wasilki“, прызначаны для беларускіх дзетак, які друкуе матарыял найбольш адпаведны і даступны для беларускіх дзетак.

Словам, маем зразуменьне важнасьці роднай асьветы, маем ахвоту да яе, маем адпаведных людзей і адпаведныя для гэтага спосабы і сродкі, дык усе разам — за сваю родную беларускую асьвету...

Biełaruskaja sprawa ŭ Sojmie

Na sioletniaj budžetnaj sesii polskaha Sojmu ukrainskimi i polskimi pasłami była padniata biełaruskaja sprawa ŭ Polščy.

U sojmawaj kamisii 15 studnia padčas dyskusii nad budžetam Ministerstwa Nutranych Spraŭ wystupaŭ u pramowie z biełaruskaj sprawaj ukrainski pasoł Z. Pełeńskyj, adznačajučy wielmi ciažkoje pałažeńnie Biełarusaŭ i stawiačy na wid biełaruskija patreby.

Paśla pramowy pasła Pełeńskaha pramaŭlaŭ tak-ža ŭ toj-ža kamisii i ŭ toj dzień ab biełaruskaj sprawie polski pasoł, wiedamy hienerał L. Želihoŭski, jaki zajawiŭ, što z ciapierašniaj polskaj palitykaj adnosna Biełarusaŭ zusim nie zhadžajecca.

Na plenumie Sojmu 18 lutaha była padniata biełaruskaja sprawa paŭtorna. Adważna i dastojna wystupiła z wialikaj pramowaj ab biełaruskaj prablemie ŭ Polščy, wialikaja baraćbitka za adradžeńnie Polskaje dziaržawy i wialikaja polskaja patryjotka, pasłanka W. Pełcynskaja. Pramowu jaje pieradrukoŭwajem z „Chr. Dumki“ na inšym miejscy.

Na hetym-ža plenarnym pasiedžańni pasoł hien. Želihoŭski paŭtorna wystupaŭ u pramowie z biełaruskaj sprawaj, prahawarwajučy ŭ abaronie Biełarusaŭ.

Pani W. Pełcynskaja ab Biełarusach

(Pieradruk z „Chryścijanskaj Dumki“ Nr. 5. 1937 h.).

Pani Wanda Pełcynskaja jość pasłom u Sojm ad Wilenščyny. 18.II sioleta jana skazała ŭ Sojmie ab Biełarusach pramowu, jakoj — pawodle „Kur. Wil.“ № 51—ahulny i hałoŭny źmiest tut drukujem.

„Siarod nacyjanalnych mieńšaściaŭ—kazała p. W. P. — biełaruskaja sprawa nie zajmaje hałoŭnaha miesca, ale adnosicca da jaje treba pawažna, choćby dziela taho, što sprawa heta maje žyćciowaje napiaćcie. Na praciahu 19 stahoddzia až da wialikaj wajny na biełaruskich ziemlach adbywałasia rusyfikacyja. Nažal i niekatoryja polskija palityki, biełaruskuju nacyjanalnuju świedamaść i warožaść da Polščy časta ŭważajuć za adno i toje samaje i hetkim čynam padświedama paddzieržwajuć henu rusyfikatarskuju palityku i kirujuć Biełarusaŭ ŭ bok rasiejščyny.

Pani W. P. dalokaja ad taho, kab pieraaceniwać siłu biełaruskaha ruchu, ale takža sama nia wiera, kab u wialikaj swajej masie biełaruski sielanin zabyŭsia swajej mowy i spolščyŭsia. Wośža niedarečnaściaj było-b zabaraniać hawaryć pabiełarusku ŭ uradach, nie dapuskać biełaruskaj mowy ŭ polskim radyjo, a biełaruski abjezdny teatr uważać za niešta prastupnaje. Baraćba z biełaruskim jazykom moža ŭ wyniku dać tolki paćućcio apryćnaści nawat tam, dzie jšče hetaha niama.

Nia treba tak-ža biełaruskaha ruchu ŭważać, jak niešta štučnaje i minajučaje. Hety ruch maje naturalnyja i realnyja asnowy i mahčymaści swajho razwoju. Kali nawat źlikwidawać tuju ci inšuju biełaruskuju arhanizacyju, dyk heta susim nia znača, što hetym užo źlikwidujecca biełaruski nacyjanalny ruch. Palityka zabarony i pieraškodaŭ kulturna - praświetnaj biełaruskaj pracy budzić zwyčajna niawieru ŭ mahčymaść lehalnaj pracy, uzbudžaje nienawiść da ŭładaŭ, budzić paćućcio ŭłasnaj siły i ŭreście — što najważniejšaje— zmušaje da nielehalnaj pracy i wiadzie da zbližeńnia z kamunistymi.

U biełaruskim siale wyrastaje ŭžo nowaja sprawa — heta sprawa biełaruskaj intelihiencyi, katoraja nia maje naturalnaha adpływu i žywie na siale ŭ biadzie i časta ŭ halicie. Tymčasam hety ludzki matarыjał jość wartasnym i treba jaho adpawiedna wykarystać. Biełaruskaj intelihiencyi treba dawać pasady ŭ dziaržaŭnych uradach.

Pani W. P. wiera, što Premjer wyniščyć zwyčaj šukańnia dziaržaŭnaj nielojalnaści ŭ tych hramadzian Polščy, jakija wyraźniej, čym inšyja pryznajucca da biełaruskaj nacyjanalnaści. Wiera tak-ža, sto Premjer spynić nakładańnie karaŭ za wiodry, za studni, za śmietnik, za sabaku — tady, kali sapraŭdy raschodzicca ab nacyjanalnuju palityku

Uradawiec, što biespasredna stykajecca z biełaruskim nasielnictwam, pawinien znać biełaruskuju mowu, kab mahčy z im parazumiecca.

Biełaruski sielanin choča čytać, ale nia maje čaho. Zakryćcio „Bieł. Krynicy“ jość pamyłkowym. Z adsutnaści biełaruskaj hazety sialanie čytajuć rasiejskuju. —

Hetak bolš-mienš wyhladaje mowa ab Biełarusach p. W. P. Wiedama, usiaho ab nas jana nie skazała, dy j toje, što skazała—zrazumiełaja reč, z punktu hledźańnia wykłučna polskaha — dalokim jość da taho, jak biełaruski nacyjanalny ruch u Polščy wyhladaje sapraŭdy. Adnak treba śćwierdzić, što mowa p. W. P. — heta hołas śmieły i šlachotny, što šmat u sabie maje praŭdy, i što Biełarusy jej i za heta pawinny być udziačny.

Тарас Шэвчэнка— прарок Украіны.

З году ў год наш братні Украінскі народ 15 сакавіка сьвяткуе дзень прарока Украіны, Тараса Шэвчэнкі.

І зразумела.

Тарас Шэвчэнка гэта ня толькі украінскі паэта, які даў Украінскаму народу „Кобзаря“ і агулам сваю бязсьмертную літаратурную творчасьць, але гэта украінскі Прарок, Павадыр, Вучыцель. Праз Яго абʼявіўся геній Украінскага народу, які вывіў украінскую мінуўшчыну, каб у сучаснасьці каваць вялікую будучыню.

Дзеля гэтага Шэвчэнка сярод Украінцаў усьцяж жыве Ён будзе жыць заўсёды, пакуль будзе жывым Украінскі народ.

У Літоўцаў.

Народнае літоўскае сьвята. 16 лютага сёл. літоўцы ўрачыста сьвяткавалі 19-я ўгодкі абвешчаньня свае незалежнасьці. У Коўну на гэта сьвята прыяжджаў шэф штабу СССР маршал Егораў. Сьвята гэта адпаведна сьвяткавалі і літоўцы віленскія.

Адв. Юхневіча апраўдалі. Ведамы літоўскі дзеяч у Вільні адвакат А. Юхневіч быў абвінавачаны за „niechęć do Państwa Polskiego“, бо быццам пашыраў часапіс „Jaunimo Draugas“, на вокладцы катарага быў адпаведны артыкул і рысунак. Суд аднак ня бачыў у закідах дэмонстрацыйнасьці і абвінавачанага 16.II.1937 апраўдаў.

Забаранілі. 12 лютага сёл. Віленскае Ваяводзтва забараніла ўсякую дзейнасьць аддзелаў, гурткоў і таварыстваў Літоўскага Земляробскага Т-ва ў Вільні на абшары прыгранічнай паласы Віленскага ваявод.

16 лютага тое-ж Ваяводзвта пацьвердзіла выданую перш Віленскім Гарадзкім Стараствам забарону дзейнасьці Літоўскага Тымчасовага Нацыянальнага Камітэту ў Вільні, зазначаючы, што гэта ня выключае справы рэестрацыі прадстаўленага праекту статуту т-ва „Літоўскі Нацыянальны Камітэт“.

10-я ўгодкі сьмерці Д-ра Басановіча. Сёлета 16 лютага прыпадаюць 10-я ўгодкі сьмерці патрыярха літоўскага народнага адраджэньня Д-ра Басановіча, магіла якога знаходзіцца на могілках Росса ў Вільні.

„Віленскі Інстытут“ у Коўне. Газэты пішуць, што Літоўскі Саюз Вызваленьня Вільні апрацаваў і падаў да зацьверджаньня статут новага „Віленскага Інстытуту“, — навуковай установы, якая будзе займацца вывучэньнем этнографіі, гісторыі, культуры, гаспадаркі і грамадзкіх, праўных і палітычных праблемаў Віленшчыны. Дырэктарам Інстытуту будзе праф. М. Біржышка, б. старшыня „Саюзу Вызваленьня Вільні“.

Dr. Jadwiga i Stanisłaŭ Hrynkiewičy.

Jak dawać hrudzi dziciaci

Wykupany i apranuty nowarodžany najčaściej zasynaje na niekalki hadzin. Maci tady adpačywaje pa radoch. Paśla 5—6 hadzinaŭ dzicia pračychajecca i płačam damahajecca jeści. Maci maje tady ŭžo małako ŭ hrudziach i dzicia treba pieršy raz prystawić.

Nowarodžany maje ŭ swaich kiškach hustuju, čornuju, jak smała, abo čornawata-zialonaje źmieściwa. Kab dzicia mahło dobra prymać małako, treba kiški z henaha źmieściwa ačyścić. Dziela henaje mety, kab nie dawać dziciaci lakarstwaŭ, pryroda daje ŭžo hatowy lek, jaki znachodzicca ŭ hrudzioch maciary. Heny lek jość u *małodziwie.* Małodziwa, jakoje dzicia smokča, prahaniaje ŭsieńka niepatrebnaje z kišok. Kali ŭ paru dzion pa radoch žywocik nie ačyščajecca i dzicia robicca niespakojnym — treba ŭlić jamu ŭ adchodnuju kišku krychu letniaje wady, abo pracedžanaha rumianku, abo dać wypić (nia bolš jak poŭłyžački ad harbaty) rycyny.

Paraducha kormić dzicia, ležačy na baku, adnoju rukoju padtrymliwajučy hałoŭku dziciaci, druhoju rukoju adciahiwajučy hrudzi, kab dzicia mahło swabodna dychać praz nos.

Kali dzicia lišnie słaboje, dyk nie adrazu smokča, abo znoŭ kali ŭ hrudziach zašmat małaka, dyk znoŭ ciažka jamu schapić u rocik barodaŭku. Tutaka treba, kab maci razumna sabie pamahła.

Kali-b pa radoch było pačatkawa mała małaka, treba dzicia čaściej prystaŭlać da hrudziej. Kali-b adnak i paśla niekalki dzion małaka nia prybywała, a hałodnaje dzicia płačam pakazwała hoład, dyk možna *naparyć rumianku* —adnu harbatniuju łožačku rumianku zalić adnoju šklańkaju wady pierawaranaje i zakryć nakryŭkaj, kab naciahnuła. Potym pracadzić i zasaładzić (nie zašmat). Načyńnie, jakoje biarecca dla dziciaci, pawinna być čystaje i sparanaje haračaju, pierawaranaju wadoju. Nichto nia moža prabawać ježy dla dziciaci hubami. Kab źwiedać, ci ježa nie zaharačaja, dyk puskajuć kaplu na hołuju ruku, nižej łakcia. Kali nie piače, dyk dobraja. Dajučy dziciaci nia łožačkaju, a ŭ butelcy, dyk butelku z napitkam prykłaści sabie da woka, papluščyŭšy sabie pierad hetym wočy, i pahladzieć, kab korm nia byŭ ani zaharačy, ani zachałodny. Rumianku dzicia nie pawinna wypić naraz bolš jak 1|5 šklanki, heta značycca 8—10 harbatnich łyžačak. Pačakaŭšy hadzinu — jznoŭ prystawić da hrudziej Nia možna *nikoli* dawać biaz pryčyny zamiest rumianku karowinaha małaka, chiba što maci chworaja i dziciaci karmić sama nia budzie. Kali dzicia rumianku nia prymaje i wanituje, dyk kab jaho zaspakoić, treba dać jamu prosta ciopłaje, pierawaranaje wady, krychu asałodžanaje abo na't zusim biaz cukru.

Užo ad samaha pačatku, kali maci maje dawoli kormu ŭ hrudziach, treba dzicia prystaŭlać tolki ŭ peŭnych hadzinach. Prystaŭlajučy dzicia za časta, nie dajem hrudziam adpačywać, małako kiepska wydzialajecca, samyja-ž hrudzi robiacca miakkimi i jany pačynajuć abwisać.

U praciahu pieršych dwoch miesiacaŭ treba dawać hrudzi kožnyja dźwie hadziny —nie čaściej. Kali-ž u hrudziach dawoli kormu i dzicia zaraz zusim dasyta najadajecca, možna prystaŭlać kožnyja try hadziny.

Ad treciaha miesiaca, kali hrudzi ŭžo dobra pracujuć, karmić kožnyja try hadziny. Dzicia na raz chaj smokča tolki adnu hrudź, kab druhaja adpačywała. Nikoli nia možna dawać adnaje tolki hrudzi wykłučna, dziela taho, što robicca tady lohka zapaleńnie henaje hrudzi, jakoje dzicia nia smokča.

Dzicia, jakoje začasta kormicca, maje straŭnik lišnie pieramučany. U straŭniku sabirajucca tady kiśli, z čaho prychodzić uzdućcio, kolka, wanity abo wolnaść. Dzicia kryčyć, płača, pierabiraje nožkami. Maci, dumajučy, što dzicia płača z hoładu, prystaŭlaje jaho da hrudziej. Pakul jano smokča, krychu supakojwajecca, zaraz adnak boli wiartajucca jašče z bolšaju natuhaju. Dziela hetaha najlepš tady dać adpačyć straŭniku, robiačy pieraryŭ u karmleńni na niekalki hadzin. Nie adna maci dumaje, što dzicia kryčyć tady, kali jano hałodnaje. Treba zaŭsiody pomnić, što dzicia *krykam i płačam abjaŭlaje ab boli j ab hoładzie.*

Dzicia kryčyć, kali zamočycca abo papeckajecca swaimi wyparažnieńniami. Mokryja pialuški dražniać wakolicu dzietarodnych orhanaŭ, pachwiny, wakolicu adchodnaje kiški. Tam bywajuć časta treščyny i mača łučyŭšy tudy, wyklikaje silnyja boli. Jasna, što dzicia tady treba abcierci, zasypać pachwiny pudraju, a wakolicu adchodnaje kiški pašmarawać wazalinaju abo lanalinaju.

(d. b.)

Да Падпішчыкаў і Чытачоў „Беларускай Крыніцы“

БЕЛАРУСЫ!

„Беларуская Крыніца“ выдаецца коштам складак і ахвяр яе чытачоў. **Складка**: на год — 4 зл., на паўгоду — 2 зл., на тры месяцы — 1 зл.

Спыненьне **„Бел. Крыніцы“** спыніла ад сёлетняга Новага Году так-жа і складкі на нашую газэту, што паставіла выдавецтва „Бел. Крыніцы“ ў вельмі цяжкое матарыяльнае палажэньне.

Далейшы лёс „Беларускай Крыніцы“ залежны ад яе падпішчыкаў і чытачоў.

Каб „Беларуская Крыніца“ далей выходзіла і магчыма нармальна, патрэбныя на яе выдаваньне грошы.

Дзеля гэтага выдавецтва „Беларускай Крыніцы“ зварочваецца да Паважаных сваіх сталых Падпішчыкаў і нагодных Чытачоў з заклікам абнавіць падпіску і прысылаць складку на газэту.

Грошы слаць на адрыс: „Biełaruskaja Krynica“ Wilno, Zawalna 1—1.

Выдавецтва „Бел. Крыніцы“.

З беларускага жыцьця

Зачынілі. Беларускі Інстытут Гаспадаркі і Культуры і Таварыства Беларускай Школы зачынены пастановай Віленскага Ваяводзтва з дня 22 студня сёлета.

Тры разы забаранілі. Пасьля прыпыненьня „Беларускай Крыніцы“ віленскія беларусы тры разы рабілі спробы выдаваньня кожны раз новай беларускай палітычнай газэты. За кожным разам аднак Віленскае Гарадзкое Стараства выхад такой газэты забараняла, мотывуючы такое становішча тым, што „ўжо зложана паведамленьне аб беларускім часапісе з падобным назовам.“

Біскуп пазволіў, а падуладны забараніў. Увосені мін. 1936 г. віленскія беларусы-каталікі арганізавалі „Каталіцкую Акцыю для Беларусаў.“ Рабілася гэта з ведама і дазволу мясцовага арцыбіскупа Ялбжыкоўскага. І аднак... арганізатары „Катал. А д. Б.“ дасталі анагдай з Інстытуту Катал. Акцыі паведамленьне, датаванае 4 г. м., што Каталіцкая Акцыя ня будзе зацьверджана.

Забаранілі лекцыю Кс. А. Станкевіча. У нядзелю 7 лютага Кс. рэдактар А. Станкевіч меўся прачытаць чарговую сваю публічную навуковую лекцыю на тэму: „Праф. М. Баброўскі і беларускі адраджэнскі рух.“ Віленскае гарадзкое стараства аднак гэту лекцыю забараніла, тлумачачы гэта патрэбамі захаваньня публічнага супакою.

Супольны запусны вечар студэнтаў беларусаў, літоўцаў і украінцаў — адбыўся 6 лютага сёлета ў залі ім. Вітаўта Вялікага пры вул. Домброўскага № 5 у Вільні.

Рэвізія ў рэдакцыі „Wiadomośc[i] Białoruskie.“ 10 лютага сёл. сьледчыя ўлады м. Вільні рабілі рэвізію ў рэдакцыі інфармацыйна-прэсавага бюлетэню „Wiadomości Białoruskie,“ у прыватным памешчаньні рэдактара й выдаўца гэтага бюлетэню інж. А. Клімовіча і ў старшыні Б.Н.А. рэд. Я. Пазьняка. Забралі толькі павеляч да адбіваньня друкаў.

Беларусы ў Варшаве. Стараньнем беларускай калёніі ў Варшаве, дня 6 лютага 1937 г. ў залі Варшаўскай Фільгармоніі быў сарганізаваны беларускі вечар, прысьвячаны беларускай песьні й музыцы.

Агульны Сход Бел. Нав. Т-ва адбыўся 28.ІІ сёлета, на якім былі выбраны ўлады Т-ва і абгаворааны арганізацыйныя справы.

Пад надзорам паліцыі. 27 лютага сёл. рэд. Я. Пазьняк быў паведамлены, што ён, у зьвязку з судовымі справамі за „Беларускую Крыніцу“; павінен кожны тыдзень яўляцца ў паліцыю. У гэтай справе адбудзецца 24 г. м. суд.

Лекцыя Кс. Ад. Станкевіча ў Т-ве Прыяцеляў Беларусаведы. 7 сакавіка сёл. ў Т-ве Прыяцеляў Беларусаведы пры Віленскім Унівэрсытэце Кс. Ад. Станкевіч прачытаў лекцыю аб праф. М. Баброўскім.

Канфіскаты. 28 лютага сёлета адмін. ўлады сканфіскавалі аднаднёўку „Беларуская Доля“, якую ўлажыў і выдаў Язэп Ярмалковіч. Сканфіскавана так-жа кніжка Улад. Ініцкага „Сон Гаўрылы“, выданая ў 1929 г.

Маладыя беларускія лекары. 15 лютага сёл. на Віленскім Унівэрсытэце зложылі лекарскую прысягу два беларусы-сябры Беларускага Студэнцкага Саюзу: Віктар Войтэнка і Вітаўт Тумаш. Віншуем!

У беларусаў-каталікоў. 14.ІІ.37 адбыўся агульны гадавы сход Т-ва „Беларускае Каталіцкае Выдавецтва“. Старшынёй Т-ва на далей выбраны Кс. Ад. Станкевіч. З Ураду Т-ва выбыў Кс. Гадлеўскі, на месца якога выбраны Кс. Я. Гэрмановіч.— Ад 25 да 28 лютага Кс. Я. Гэрмановіч кіраваў вялікапоснымі рэкалекцыямі Віленскіх беларусаў-каталікоў.

Беларусы ў гімназіях. Паводле афіцыяльных статыстычных аблічэньняў на абшары Віленскай Школьнай Куратарыі (ваяводзтвы: Віленскае, Наваградзкае і часьць Беластоцкага) ў дзяржаўных гімназіях сёлета з агульнага ліку 8004 вучняў, беларусамі запісаліся 496 чалавек, з гэтага ў самай Вільні — 174 чалавекі. — У гэтым-жа часе і на тым-жа абшары Куратарыі ў прыватных гімназіях з агульнага ліку 5615 вучняў, беларусамі запісаны 95 чалавек. Разам-жа ў гімназіях дзяржаўных і прыватных на абшары Віленскай Школьнай Куратарыі беларусамі запісаны 591 чалавек і „тутэйшымі“ (48+7=) 55 чалавек.

Сярод беларускае вучнёўскае моладзі. 14.ІІ.37 адбыўся гадавы сход Гуртка Прыяцеляў Беларускіх Скаўтаў. Старшынёй Гуртка і на далей астаўся вучыцель Віл. Беларускай гімназіі Кс. Глякоўскі. — 3.ІІІ.37 вучні Віл. Бел. Гімназіі ладзілі канцэрт-вечар. Сьпяваў хор пад кіраўніцтвам Р. Шырмы.

Аўторскі Вечар Н. Арсеньневай. Т-ва Прыяцеляў Беларусаведы пры Віленскім Унівэрсытэце разам з Беларускім Студэнцкім Саюзам ладзілі ў нядзелю 17 студня сёл. Аўтарскі Вечар беларускай паэткі Натальлі Арсеньневай. Паважаная поэтка прачытала цэлы рад найнавейшых сваіх поэтыцкіх твораў, дагэтуль нігдзе недрукаваных.

Публічныя беларускія лекцыі. 24 студня сёл. у залі пры Завальнай вул. 1, інж. А. Клімовіч прачытаў публічную лекцыю на тэму „Чэхаславаччына, — край і людзі,“ а 31 студня сёл. там-жа Кс. Ад. Станкевіч прачытаў такую-ж лекцыю на тэму „Магнушэўскі і беларускае нацыянальнае адраджэньне.“

Беларускія паэты хварэюць. Беларускі байкапісец і сатырык Я. Быліна даўжэйшы ўжо час хварэе на грудзі і 24 студня выехаў лячыцца ў Закапанае. Паважна занямог так-жа на грудзі і М. Танк, які нядаўна вярнуўся з санаторыі ў Атвоцку.

Канфіската. Адміністрацыйныя ўлады м. Вільні сканфіскавалі анагдай рэшту кніжкі „Шум баравы“— М. Васілька, якая была выдана йшчэ ў 1929 г.

Hramadzkaje ŭhrupawańnie ŭ Polščy.

Hramadzkaje ŭhrupawańnie ŭ Polščy prajawiłasia sioleta kanhresami polskich palityčnych arhanizacyjaŭ — „Stronnictwa Ludowaha“ „Polskaj Partyi Socyjalistyčnaj“ (PPS), źjezdam u Waršawie dziejačoŭ endecyi i paŭstańniem nowaj palityčnaj arhanizacyi p. n. „Obóz Zjednoczenia Narodowego“ (OZN).

Kanhres „Stronnictwa Ludowaha.“

Sioleta ŭ studni—15, 16 i 17 — adbyŭsia ŭ Waršawie wialiki kanhres polskaj sialanskaj palityčnaj arhanizacyi „Stronnictwa Ludowaha,“ na jakim byli pradstaŭniki polskaha sialanstwa amal z usich kutkoŭ etnohrafičnaj Polščy, a pierawažna z Haliččyny. Hety kanhres źwiarnuŭ šmat uwahi na arhanizawanaje polskaje sialanstwa nia tolki siarod polskaha hramadzianstwa, ale tak-ža i zahranicaj.

Polskaja Partyja Socyjalistyčnaja (PPS) prysłała kanhresu „Str. Lud.“ bratni prywiet i poŭnaje pryznańnie, wyražajučy swaju hatoŭnaść supracoŭnictwa z „Str. Lud.“ dziela asiahnieńnia supolnych ideałaŭ.

Hety kanhres „Str. Ludowaha“ pryniaŭ cełу rad rezalucyjaŭ, u jakich, miž inšym, skazana wyrazna, što polskamu sialanstwu nie padarozie ani z kamunizmam, ani z fašyzmam, a dziela hetaha „Stronnictwo Ludowe“ staić na platformie swabodnaha demokratyzmu i imkniecca da prawiadzieńnia demokratyčnych pastulataŭ u žyćcio.

Ahułam kažučy — pastanowy kanhresu „Str. Lud.“ charaktaram ideowa - palityčnym, za wyniatkam adnosinaŭ da niedziaržaŭnych narodaŭ, zusim padobnyja da pastanowaŭ centralnych uładaŭ „Biełaruskaha Narodnaha Abjednańnia“ (BNA), katoryja abwieščany kamunikatam № 5 z 16.VI.1936 h. u numary 31 „Biel. Krynicy“ za 1936 h.

Treba adznačyć, što kanhres „Str. Lud.“ da h. zw. terytoryjalnych narodnych mienšaściaŭ, asabliwa adnosna Biełarusaŭ, nie zaniaŭ nijakaha stanowišča, byccam paćwiardžajučy konserwatyŭna endeckija dokazy, što ŭ hranicach Polskaj dziaržawy biełarusaŭ treba asymiloŭwać, dyk niama i biełaruskaj prablemy.

Wiedama, što takoje stanowišča falšywaje, što paćwiardžajuć polska-patryjatyčnyja wystupleńni ŭ Sojmie na sioletniaj budžetnaj sesii pasła hien. L. Želihoŭskaha i patryjatyčnaja wialikaha palityčnaha značeńnia pramowa pasłanki W. Pełčynskaj.

Kanhres PPS.

Paśla kanhresu sialanskaj arhanizacyi, zaraz-ža —31 studnia, 1 i 2 lutaha adbyŭsia ŭ Radomie kanhres

Z baspadarki.

Jak pryhatavacca da rańniaha vysiedžvańnia kuraniat?

Pradukcyja rańnich kurčat vymahaje ad hadaŭca šmat pracy i starańniaŭ. Cel hety možna asiahnuć pry planovaj i dobra zarhanizavanaj pracy; usialakija, choć najmienšyja niedahlady i niedaceńvańni hetaj vielmi składnoj haliny, drenna adbivajucca na ahulnaj hadoŭli.

Studzień jość miesiacam pryhatavaŭčaj pracy da pradukcyi raspłodnych jajok i rańniaha nasadžvańnia. Pa abličeńni zimovaj niasučaści, vybirajem kurej najbolš niasuščvch, robim z ich asobnuju hrupku (15-20 štuk) i dajom im pieŭnia.

Kury, što źnieśli ŭ hod kala 200 i bolš jajok, mohuć užo naležyć da hetaj razvodnaj hrupy. Aprača śćvierdžańnia niasučaści, treba jšče śćvierdzić zdaroŭje i dobruju fizyčnuju budovu, — usie kury z jakimi-niebudź, niedastatkami nia mohuć da takich razvodnych stadaŭ naležać; tolki zdarovyja i dobra raźvityja kury mohuć dać jajki narmalnaj vialičyni, pradbačanyja dla danaj rasy — a hetym samym nadajucca dla raspłodu.

U hełakich stadach najhałaŭniejšuju rolu adyhryvaje pievień. Pavinien jon mieć „radavod“, ci inačaj, musim viedać, pa jakoj jon kurycy pachodzić, dalej musić mieć usie charakterystyčnyja rysy dla svajej rasy: pavinien być dobra zbudavany, zdarovy, mieć enerhičny vyhlad. Pierakazvajučy svaje jakaśći na patomstva, pievień moža na jaho ŭpłyvać adjemna. Najlepšy pracent zapłodnianych jajok dajuć 11—12-ci miesiačnyia pieŭni, katoryja ŭžo ŭ hetym vieku asiahnuli poŭny fizyčny razvoj; dobryja taksama pieŭni 2 letnija; staršyja ŭžyvajucca ŭ vyniatkavych vypadkach, pryjmajučy pad uvahu vielmi dobraje ich pachodžańnie, abo kali dajuć silnaje i dobra niasučajesia patomstva.

Vykarmlivańnie takich razvodnych stadaŭ, pradukujučych raspładovyja jajki, zbližanaje da vykarmlivańnia kurej naahuł niasuščychsia. Tolki musim brać pad uvahu peŭnyja pašy, pajmienna, kab u ich byŭ fosfar u postaci fosfara-vapniovaj muki, vitaminy ŭ postaci burakoŭ i kapusty, pašy mineralnyja, jak vuhal, vapna i da pićcia posnaje (adtłuščanaje) małako, katoraje ŭ hetym vypadku maje ahramadnaje značeńnie, bo maje ŭ sabie šmat białka, a da taho, jak lubimy papoi kury šmat bolš jaho vypivajuć, čym arhanizm patrabuje vady, pryčyniajučysia hetym dla bolšaj kolkaści jajok, što jość važnym dla raspładovych jajok, i sama kuryca ŭtrymlivajecca ŭ dobrym stanie. Dla pradukcyi raspładovych jajok pašy musiać być razmavityja: nie davać šmat białka pachodžańnia źviarynaha, a ŭ mieru mahčymaści kłaści hałoŭny nacisk na białko pachodžańnia raślinnaha. Ciopły i suchi kuračy katuch padachvočvaje kurej hrebacca, a hetym samym zmušaje da zaŭsiodnaha ruchu: katuch nie pavinien być ciesny; na 1 metr kvadratovy, padłohi katucha nia moža prypadać bolš jak 3 kurycy. Padścilka ŭ hniozdach pavinna być suchaja j čystaja, bo jajok raspładovych myć nia možna; jany pakrytyja kleistaj(vaskovaj) pavałonaj, katoraja baronić jajki pierad lišnim vysychańniem i nie dapuščaje ŭ nutro roznych škodnych drabnatvoraŭ.

Raspładovyja jajki treba vybirać narmalnaj formy, vahi nia mienšaj jak 55 gramaŭ; vielmi vialikich jajok na raspłod užyvać nia radziać. Raspładovyja jajki nie pavinny być starejšyja jak 10 dzion, a najlepš 3—7 dniovyja, pierachovyvanyja ŭ temperatury ad 5° da 10°. Kali jajki [illegible]yja pieravoziacca i jość padazreńnie, što jany straślisia, dyk takich jajok nia možna adrazu kłaści pad kvaktuchu, ale treba — pałažyć u zimnym miescy i tolki pa dvuch dnioch, kali viernucca da pieršapačatnaha stanu, možna ich kłaści pad kurycu.

Rańniaje nasadžvańnie kurej najlepš pravodzić štučna pry pomačy hetak zvanaha inkubatara. Dziela niastačy kvaktuch u hetym časie da naturalnaha vysiedžvańnia možna prymusova nasadžvać indyčki, jakija dajucca nasadzić tolki rana (najlepš miž 1 i 15 lutaha), bo paźniej, jak u samoj indyčki narastajuć jajki, nia možna ŭžo zmusić jaje da siadzieńnia.

Hetyja ŭstupnyja pryhatavaŭčyja pracy kanieśnyja dla kožnaj hadoŭli. Daduć jany mahčymaść pravilna pracavać u nastupnych miesiacach, kali treba šmat starannaści i dasužaści pry vysiedžyvańni i hadoŭli kuraniat.

A. V.

„Tyg. Roln.“

Беларусы! Чытайце і пашырайце свае беларускія кніжкі і газэты!

arhanizacyi rabotnickaj — „Polskaj Partyi Socyjalistyčnaj“ (PPS). Kanhres byŭ wialiki; na kanhresie byŭ, jak hość, pradstaŭnik II Socyjalistyčnaha Internacyjanału Jan Lonžé — pasoł francuskaha parlamantu.

Kanhresu PPS prysłała swoj prywiet „Stronnictwo Ludowe,“ mienš-bolš, takoha źmiestu:

— Na roŭni z wami pryznajom mnohija supolnyja intaresy, za jakija musim zmahacca supolna; u baraćbie z usialakaj dyktaturaj, u zmahańni za pašyreńnie demokratyzmu sialanie, zarhanizawanyja ŭ „Str. Lud.“, pojduć supolna z pracoŭnaj hramadoj, abjednanaj pad ściahami PPS. —

U kancy naradaŭ kanhres PPS pryniaŭ pastanowy, wykazwajučy swajo demoktratyčnaje stanowišča, škirawanaje jak prociŭ kamunizmu, taksama i prociŭ fašyzmu.

Kamunizm, jak świardžaje hety kanhres, nia maje ničoha supolnaha z socyjalizmam i supiarečny z idejami wolnaha demokratyzmu, što paćwiardžajuć fakty eksperymentalnaj palityki ŭ SSSR., prawodžanaj tam kamunistymi ŭsialakich „ukłonaŭ.“

Fašyzm, taksama, jak i kamunizm supiarečny z idejami demokratyzmu, adnosna jakoha treba suproćstawić dźwie realnyja siły — rabotnicki i sialanski ruchi, abjednanyja ŭ adnu supolnaść.

Adnosna-ž narodnych mienšaściaŭ, asabliwa adnosna Biełarusaŭ, kanhres PPS wyraznaha stanowišča nie zaniaŭ — hetuju ważnuju prablemu ŭ Polščy abniaŭ ahulnaj, ničoha niewyrašajučaj frazeolohijaj.

Słowam, ani PPS, ani „Str. Ludowe“ nie źjaŭlajucca takimi palityčnymi arhanizacyjami, jakija abymali-b prahramowa wyrašeńnie ŭsich spraŭ u Polskaj dziaržawie. Bo-ž naležnaje wyrašeńnie prablemy narodnych mienšaściaŭ u Polščy, asabliwa mienšaściaŭ h. zw. terytoryjalnych, jak Ukraincy, Biełarusy i Litoŭcy — heta prablema wialikaj sapraŭdy palityčnaj wahi, jakoj wyrašyć ani ničoha niakažučaj frazeolohijaj, ani naciskam bolšaj siły nielha. Tut patrebnaja kultura sužyćcia.

„Obóz Zjednoczenia Narodowego“ (OZN).

Sioleta 21 lutaha pałkoŭnik A. Koc abwieściŭ idejowa-palityčnuju deklaracyju, jak prahramu nowaj palityčnaj arhanizacyi. Paśla abwieščańnia hetaj deklaracyi, na jaje idejowa-palityčnaj prahramie paŭstała arhanizacyja p. n. „Obóz Zjednoczenia Narodowego“ (OZN).

Tezy idejowa-palityčnaj prahramy hetaj arhanizacyi ŭniaty ŭ 9-cioch parahrafach, wykazwajučy wysoka-patryjatyčny charaktar, abymajučy žyćcio dziaržaŭnaj arhanizacyjaj, nutranoje žyćcio apirajučy na abawiazujučaj kanstytucyi z 23.IV.1935 h. i stawiačy na najwyšejšy piedestał armiju, jak dziejnik koordynacyjny siły narodu, jaki daje mahčymaść wykanańnia wialikaha zadańnia, wypływajučaha z kanieśnaści.

Prahrama hetaj arhanizacyi wyrazna adharodžwaje žyćcio ad kamunizmu, ničoha nia kažučy ab fašyzmie i nie ŭspaminajučy ab demokratyzmie.

Adnosna terytoryjalnych nacyjanalnych mienšaściaŭ u hetaj prahramie padany takija tezy:

— z boku polskaha achwota bratniaha hramadzkaha sužyćcia na tych ziemlach, za jakija wiakami praliwali kroŭ, zakładajučy wohnišča cywilizacyi i baroniačy ich ad zachłańnia barbaryzmu; pryznawańnie narodnaj asabliwaści, pakul heta nie supiarečyć intaresam dziaržawy i nie razdzialaje muram nienawiści.

Relihijnaja sprawa stawicca hetak:

— Katalicki kaścioł musić mieć naležnuju asabliwuju apieku, a ŭsie inšyja wierawyznańni apirajuć swajo isnawańnie i dziejańnie na asnaŭnych zakonach kanstytucyi, jakija wypływajuć z polskaj tradycyi relihijnaj tolerancyi. —

Hetak mienš-bolš pradstaŭlajecca idejowa-palityčny kirunak O.Z.N.

Frahmenty mižnarodnaha pałažeńnia

— Hišpanskaja wajna nia spyniajecca. Hetaj wajnoj mnohija dziaržawy, susiednija i pastarońnija, hłyboka zacikaŭlenyja i dziela hetaha ŭ hišpanskaj nutranoj baraćbie wialikaje pryjmaje ŭčaście wonkawaja siła.

Ustanoŭlena, što zacikaŭlenyja dziaržawy amal adkryta pamahali hišpanskim wajujučym staronam: Niamieččyna i Italija pamahali paŭstancam, a Sawiety z Francyjaj — respublikancam.

Dziela spynieńnia wonkawaj dapamohi hišpanskaj wajnie h. zw. mižnarodny kamitet nieinterwencyi zarhanizawaŭ blokadu Hišpanii dziela nieprapuščańnia ŭ Hišpaniju wajennaha snaradździa i wojska zwonku. Kali-b napraŭdu i ščyra hetaja blokada ŭziałasia nie dapuščać u Hišpaniju wonkawaj padmohi wajujučym staronam — možna było-b spadziawacca chutkaha kanca bratabojčaj tam wajny.

Pa čyjej staranie ŭ Hišpanii budzie pieramoha, ci pa staranie fašystaŭ ci respublikancaŭ — ciapier zhadać trudna. Bo dasiulešnija pieramohi ŭ wialikaj miery byli zaležnyja ad wonkawaj siły.

— Niamieččyna biazupynna ŭwaružajecca. Prawodžańnie mocnych ukrapleńniaŭ uzdoŭž francuskaj hranicy, a tak-ža na linii Paznań-Berlin, pakazwaje, što niamiecki ŭrad hatowicca da wajny z uschodam i zachodam.

Niamieckimi wajennymi pryhataŭleńniami niepakoicca SSSR, niepakojacca i prybałtyckija dziaržawy.

Prybałtyckija dziaržawy — Litwa, Łatwija i Estonija, dziela supolnaj abarony daŭno ŭžo miž saboju zaklučyli sajuz i nawiazali dobrasusiedzkija adnosiny z SSSR. Hetaja dobrasusiedzkaść Litwy, Łatwii, Estonii, a tak-ža i Finlandyi pieratwaryłasia ŭ abaronny sajuz z SSSR. A heta tamu, što Niamieččyna ŭ swaich planach pachodu na ŭschod — u SSSR namiačaje šlach pachodu pa prybałtyckich pabiareźžach. Zakrapleńniem hetkaha sajuzu byli niadaŭnija adwiedziny sawieckim maršałam Jehorawym Litwy, Łatwii i Estonii, a tak-ža wizyta finlandzkaha manistra zahraničnych spraŭ u SSSR. Pry hetym treba adznačyć, što za hety sajuz staić i Francyja.

— Na Dalokim Uschodzie — u Kitaju niespakojna. Japonija swajej ekspansii ŭhłyb Kitaju nia spyniaje. Kitajcy ŭ abaronie ad japonskaha zachopnictwa časta šukajuć apiryšča ŭ balšawikoŭ.

Paśla zasnawańnia hetaj arhanizacyi pačali da jaje dałučacca mnohija lokalnyja arhanizacyi, jakija kaliś byli abo składowymi častkami Biesp. Bloku Supr. z Uradam, abo byli abniatyja sferaj upływaŭ B.B.

Usia lawica, a tak-ža i endecyja adnosna OZN wykazalisia nehatyŭna.

Źjezd endeckich dziejačoŭ.

U miž časie paŭstawańnia OZN adbyŭsia ŭ Waršawie źjezd endeckich dziejačoŭ, jakija pracujuć siarod sialanstwa. Źjezd hety byŭ nazwany źjezdam sialanskim.

Treba adznačyć, što hety źjezd nie zrabiŭ nijakaha ŭražańnia, što paćwiardžaje ab słabych upływach endecyi siarod sialanstwa. Z hetaha wywad, što endecyja maje ŭpływy tolki siarod drobnaha i siaredniaha miaščanstwa i siarod katalickaha kleru.

Ahułam — jak widać u Polščy ŭkład hramadzkich siłaŭ pradstaŭlajecca mienš-bolš hetak: 1) P.P.S. z „Stronnictwam Ludowym,“ 2) „Obóz Zjednoczenia Narodowego“ i 3) nacyjanalistyčna-klerykalnaja endecyja. Usie hetyja kirunki ŭ nutranoj palitycy miž saboju, pakulšto, nia łučacca.

Грамадзяне! Не марнуйце грошай на гарэлку і тытун!

Да Карэспандэнтаў і Супрацоўнікаў „Беларускай Крыніцы“

ГРАМАДЗЯНЕ!

Спыненьне **„Бел. Крыніцы“** было спыніўшы і друкаваньне Вашых карэспандэнцыяў аб жыцьці і жыцьцёвых патрэбах Беларусаў у вашых ваколіцах.

Узнаўляючы выдаваньне **„Бел. Крыніцы“**, заклікаем Паважаных нашых Карэспандэнтаў і Супрацоўнікаў да ўзнаўленьня сваей працы — прысыланьня ў нашую рэдакцыю вестак аб жыцьці і жыцьцёвых праявах у вашых ваколіцах, а так-жа прысыланьня карэспандэнцыяў, апісываючы галаўнейшыя патрэбы ў жыцьці нашага народу.

Пры гэтым просім пісаць выразна, коратка і ясна.

Рэдакцыя „Бел. Крыніцы“.

Polska-litoŭskija adnosiny

— Polska-litoŭskija suadnosiny nie papraŭlajucca. Niadaŭna polski min. zahr. spr. pałk. Bek, adkazwajučy na pasolskuju interpelacyju, adznačyŭ, što ŭsie starańni polskaj dyplamacyi nawiazać znosiny z Litwoju byli daremny i tracicca nadzieja na parazumieńnie z pryčyny niaŭstupčywaści Litwy, a dziela hetaha polski ŭrad biare nazad toj dawier, jaki mieŭ da litoŭskaj mirnaj palityki i budzie pastupać adnosna Litwy tak, jak Litwa adnosna Polščy. Pry hetym Polšč hatowa abapiorci swaje adnosiny da Litwy na asnowach narmalnaha susiedzkaha sužyćcia...

Litoŭski ministr zahr. spr. Lozarajtis tak-ža na pasolskuju interpelacyju ŭ litoŭskim sojmie ab narmalnym susiedzkim sužyćci Litwy z Polščaj wykazwaŭ swoj pahlad, stawiačy na wid litoŭskaje ŭ hetaj sprawie stanowišča.

Roznyja cikawaści

100-yja ŭhodki śmierci Puškina. Sioleta minuła 100 hadoŭ ad śmierci wialikaha rasiejskaha paeta Puškina. Hety jubilej Puškina abchodzili nia tolki ŭ SSSR — radzimie i duchowaj i kroŭnaj paeta — ale i zahranicaj, dy nia tolki rasiejcy, ale ŭsie inšyja sławianskija i niesławianskija narody

Słowam, usia kulturnaja Eŭropa ŭšanawała pamiać Puškina ŭ 100-yja ŭhodki jaho śmierci. Biełarusy tak-ža ładziać akademiju ŭ česć Puškina.

Niemcy denacyjanalizujuć Łužyckich Serbaŭ. Hazety padajuć ab strašennym ucisku i denacyjanalizacyi niamieckimi ŭładami Łužyckich Serbaŭ. Pa zahadu ministerstwa aświety zabaroniena wučyć serbska-łužyckaj mowy ŭ himnazii ŭ Budzišynie. Niamieckija ŭłady wysialajuć z kraju serbska-łužyckich wiaskowych wučycialoŭ; serbska-łužyckim wučycialom zabaroniena hawaryć z wučniami ŭ rodnaj mowie; u wojsku nia možna pierapisywacca z radnioj paswojemu, a tolki paniamiecku.

Słowam, nietolerantnaść niamieckaha ŭradu adnosna Sławian u poŭni prajaŭlajecca nad niaščasnymi Łužyckimi Serbami, jakim los sudziŭ žyć siarod niamieckaj bolšaści.

Z POLŠČY.

Parcelacyjny plan na 1938 h. Radaj Ministraŭ wydana rasparadžeńnie, u jakim ustanoŭleny parcelacyjny plan na 1938 h. Pawodle hetaha planu maje być rasparcelawana: u wajawodztwie Waršaŭskim 7.200 hektaraŭ ziamli, u waj. Łodzkim — 5.900 hekt., u waj. Kieleckim — 3.300 h., u waj. Lublinskim — 9.000 h., u waj. Biełastockim — 3.100 h., u waj. Nawahradzkim — 2050 h., u waj. Wilenskim — 2.000 h., u waj. Paleskim — 4.300 h., u waj. Slonskim — 150 h., u Paznanskim — 3.000 h., u Pamorskim — 19000 h., u Wałynskim — 2 000 h., u Tarnopalskim — 5.000 h., u Stanisławaŭskim — 2.000 h., u Lwoŭskim — 3.000 h. i Krakaŭskim — 2.000 hektaraŭ.

Z ZAHRANICY.

U SSSR. Paśla rastralańnia 16 trackistaŭ u studni siol. adbyŭsia ŭ Maskwie druhi čarhowy praces trackistaŭ. Sudzili 17 čaławiek, na čale z Piatakowym, Radkam i Sierabrakowym. Rastralali 13 čaławiek, u hetym liku Piatakowa i Sierabrakowa, a Radka, Sakolnikawa i inšych zasudzili na doŭhaterminowuju katarhu.

Paśla rastralańnia hetych starych balšawikoŭ, pamior u Maskwie stary balšawik Ordžonikidze.

U BSSR. Hazety padajuć, što ŭ Lepli pačaŭsia sudowy praces nad kiraŭnikami rajonnaha partyjnaha kamitetu, abwinawačanymi za narušeńnie sawieckaha prawa i nowaj kanstytucyi. Śledztwa ŭstanawiła, što abwinawačanyja prawodzili masawyja rewizii siarod kałchoźnikaŭ i indywidualnych haspadaroŭ i nakładali na ich štrafy, zmušajučy hetak sialan da wykanańnia dziaržaŭnaha planu dastawy lonu, apłaty dziaržaŭnaha padatku i inšych hrašowych składak. U adnej tolki Lachaŭskaj wołaści prawiedziena było 500 hetkich rewizijaŭ.

Hetyja masawyja rewizii, widać, aburyli sialanstwa i wyklikali wialikaje ŭzwarušeńnie, kali ŭłady za „ščyraść“ wykanańnia planu pasadzili wykanaŭcaŭ na ławu padsudnych.

Italjanskim fašystam u Abisynii horača. Abisyncy nie pryznajuć nad saboj panawańnia Italjancaŭ i ŭściaž aružna partyzanckim sposabam z akupantami zmahajucca. Nadowiačy ŭ Addis-Abebie byŭ dakanany na wice-karala Italii ŭ Abisynii maršała Graciania i jaho prybočnuju świtu bombawy napad. Za heta italjancy rastralali až 6 tysiač abisyncaŭ. U druhim miescy italjancy, paśla aružnaj baraćby z abisyncami, rastralali abisynskaha rasa Destu.

Астаўся йшчэ невялікі запас бел. календара - кніжкі п. н.

„Беларускі Сялянскі Календар на 1937 г.“

Аб вартасьці календара для нашага сяла кажа ягоны зьмест, у якім між іншым знаходзім:

Агульны агляд гаспадаркі, Дагляд над земляробскімі прыладамі і снасьцяй, Увагі аб гнаёх, Некалькі слоў аб садох, Асновы гародніцтва, Практычныя зацемкі аб жывёлагадоўлі, Аснова карменьня жывёлы, Да ведама пчаляроў, Лекарская помач. Парады для рамесьнікаў, Праўныя парады (тэстаманты і інш.), Інформацыйны аддзел і інш.

Цана календара толькі **50 грашоў**. Перасылка — 25 грашоў. Для перапрадаўцоў выгодная ўступка.

Галоўны Склад: **Беларуская Кнігарня „П А Г О Н Я“, Вільня, Завальная вул. 1—2.**

Рэдактар А. ДАСЮКЕВІЧ — Беларуская Друкарня ім. Фр. Скарыны ў Вільні, Завальная 1—2. — Выдавец А. ШУТОВІЧ